**13 лістапада 2022 г. – 80 гадоў з дня нараджэння АНТАНЮКА ГЕОРГІЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА (1942), беларускага філосафа, сацыёлага**



Георгій Аляксандравіч Антанюк нарадзіўся 13 лістапада 1942 года ў в. Мацы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька, Аляксандр Барысавіч Антанюк (1911-2003), быў кавалём, маці, Надзея Данілаўна (у дзявоцтве Яфімук; 1924–1996), працавала паляводам. Дзяцінства Георгія прыпала на нямецка-фашысцкую акупацыю, пасляваенную нястачу. У 1949-1953 гадах Георгій вучыўся ў пачатковай школе ў в. Мацы, у 1953-1959 гадах - у сярэдняй школе ў в. Стрыгава, скончыў 10 класаў.

Пасля дзесяці класаў паступіў у Магілёўскі машынабудаўнічы тэхнікум, атрымаў спецыяльнасць «тэхнік-тэхнолаг зварачнай вытворчасці». Праходзіў тэрміновую службу ў Савецкай арміі (1962–1965).

У 1965 годзе Георгій Антанюк паступіў на дзённае аддзяленне філасофскага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «філосаф», які скончыў у 1970 годзе. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі і права АН БССР (1970-1973). З 1973 года працаваў спачатку малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута філасофіі і права АН БССР (цяпер Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), прымаў удзел у правядзенні прыкладных сацыялагічных даследаванняў

У 1974 годзе Г. А. Антанюк абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Системный подход в социологическом исследовании (методологические проблемы исследования взаимоотношения социальной системы и её компонентов)», )», атрымаў ступень кандыдата філасофскіх навук.

З 1980 па чэрвень 2004 года – выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар на кафедры філасофіі АН БССР (з 1991 – НАН Беларусі, з 1998 - у складзе Інстытута філасофіі НАН Беларусі, з 2002 - Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі).

У 1990 годзе Г. А. Антанюк абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Социальное проектирование (теоретико-методологический аспект)». Доктарская дысертацыя

прысвечана тэорыі і метадалогіі праектавання сацыяльных адносін у кіраванні грамадствам. Доктар філасофскіх навук (1991), прафесар (1993).

Г. А. Антанюком апублікавана звыш 70 навуковых работ на папяровых носьбітах і звыш 100 навуковых прац выкладзены для ўсеагульнага доступу ў Інтэрнеце. Аўтар прац па праблемах сацыяльнага кіравання, сацыяльнага праектавання і міжэтнічных адносін: «Социальное проектирование и управление общественным развитием: Теоретико-методологический аспект» (1986), «Социальное проектирование в процессе практического применения социальных знаний» (1992), «Социальная идеализация, идеология и общество» (1998), «Объективная цель человечества и его стандартизация» (2003) і інш. Адзін з аўтараў кнігі «Сацыяльна-філасофскія праблемы вытворчасці і выкарыстання навуковых ведаў» (1992).

Прафесар Антанюк - наватар у распрацоўцы метадалогіі сацыяльна-інжынернага праектавання, прысвяціў гэтай тэме шэраг грунтоўных работ. Ён лічыцца адным з вядомых футуролагаў, даследчыкаў прадметнай логікі, сацыяльных інжынераў-метадолагаў сацыяльнай інжынерыі і сістэмных падыходаў у сацыялогіі.

З 1990-х гадоў Георгій Аляксандравіч паступова пераходзіць да крытычнага пераасэнсавання філасофіі і ў цэлым ідэалогіі як крыніцы аб’ектыўнага пазнання. Даследуе агульнасацыяльныя і агульнафіласофскія праблемы, вывучае праблемы сістэмнага падыходу ў сацыялагічным даследаванні, метадалогіі навуковага пазнання, а таксама маралі, палітыкі, ідэалогіі і дзяржаўнага будаўніцтва, рэлігіі, нацыянальна-этнічных адносін і інш. З 1992 года рэгулярна публікуецца ў СМІ па розных актуальных праблемах Беларусі і Расіі і праблемах, якія існуюць ва ўзаемаадносінах паміж нашымі краінамі.

Не забываў ніколі Георгій Антанюк пра сваю малую радзіму. Пра гэта яскрава сведчыць і адзін з яго артыкулаў у газеце «Збудінне» — «Заходнія палешукі: іх шлях да сусветнай гісторыі (кароткая гістарычная даведка)».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат.
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

## Працы Г. А. Антанюка

**Антонюк, Г. А.** Социальное проектирование и управление общественным развитием : теоретико-методологический аспект / Георгий Александрович Антонюк ; АН БССР, Кафедра философии. - Минск : Наука и техника, 1986. - 205 с.

**Антонюк, Г. А.** Социальное проектирование (теоретико-методологический аспект) : диссертация ... доктора философских наук : 09.00.01 / Георгий Александрович Антонюк. - Минск, 1990.

**Антонюк, Г. А.** Социальное проектирование (теоретико-методо-логический аспект) : автореферат диссертации ... доктора философских наук : (09.00.01) / Г. А. Антонюк ; АН БССР, Ин-т философии и права. – Минск, 1989. – 39, [1] с.

**Антонюк, Г. А.** Системный подход в социологическом исследовании (методологические проблемы исследования взаимоотношения социальной системы и ее компонентов) : диссертация …. кандидата философских наук / Георгий Александрович Антонюк ; АН БССР, Ин-т философии и права. - Минск : [б. и.], 1974. - 196 с.

**Антонюк, Г. А**. Белоруссияне / Г. А. Антонюк // Восточнославянские страны в эпоху глобализации: выбор путей развития. - Гродно, 2003.

**Антонюк, Г. А.** Национальная идея / Г. А. Антонюк // Этносоциальные и конфесиональные процессы в современном обществе : сборник. - Гродно : ГрГУ, 2000.

**Антонюк, Г. А**. Социальное проектирование : некоторые методологические аспекты / Г. А. Антонюк. – Минск : Наука и техника, 1978. – 127 с.

**Антонюк, Г. А.** Социально-философские проблемы производства и применения научных знаний / Г. А. Антонюк [и др.] ; под ред. А. И. Головнева ; Академия наук Беларуси, Кафедра философии. - Минск : Навука і тэхніка, 1992. - 255, [1] с.

**Антонюк, Г. А.** Социальное творчество и конструктивно-инженерный подход к управлению общественными процессами / Г. А. Антонюк // Методологические проблемы научного знания. - Минск, 1983.

**Антонюк, Г. А.** Объективная цель человечества и его стандартизация / Г. А. Антонюк // Восточнославянские страны в эпоху глобализации: выбор путей развития. - Гродно, 2003.

**Вопросы управления исследованиями и разработками** : сб. науч. трудов / [Г. А. Антонюк и др.]. – Минск : ИТМО, 1979. – 219 с. : черт.

**Методологические** проблемы научного знания / [Г. А. Антонюк и др.] ; АН БССР, Кафедра философии. – Минск : Наука и техника, 1983. – 239 с.

**Чалавек** і грамадства : энцыклапедычны даведнік / [У. Л. Абушэнка, Т. І. Адула, Г. А. Антанюк і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1998. – 285 с. : фот. – (Энцыклапедычная бібліятэчка школьніка).

**Антонюк, Г. А**. Идеологи и правители (антиидеологическая защита государства и его правителей) / Г. А. Антонюк // Гуманитарно-экономический вестник. - 1999. - № 2.

**Антонюк, Г. А.** Идеология, идеализация и вера / Г. А. Антонюк // Гуманитарно-экономический вестник. - 1998. – № 2.

**Антонюк, Г. А.** Марксистская философия, вера и новый рационализм / Г. А. Антонюк // Гуманитарно-экономический вестник. - 1997. - № 4.

**Антонюк, Г. А**. Западные полешуки: их путь во всемирной истории (краткая историческая справка) / Г. А. Антонюк // Збудінне. - 1993. - № 6.

### ***Аб жыцці і дзейнасці Г. А. Антанюка***

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 1. – С. 382.

**Антонюк Георгий Александрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Мінск, 2009. – Кн. 1. - С. 22.

**Антонюк Георгий Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] – Минск, 2006. – Т. 2. – С. 122.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2010. – Т. 1. - С. 171.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 431. – (Імі ганарацца землякі).

**Елсуков, А. Н.** Антонюк Георгий Александрович / А. Н. Елсуков // Социологическая энциклопедия. – Минск, 2005. – С. 20.

**Знаменитые** земляки // Открытое акционерное общество «Стригово» / [автор текста Е. Жук ; главный редактор В. Шпарло ; фото А. Рыбачука, Г. Козловского]. - Брест, 2021. – С. 20-21. : ил., цв. ил., портр.

**Кавецкий, С. Т.** Брестчина социологическая. Антонюк Георгий Александрович / С. Т. Кавецкий // Брестский социологический барометр / С. Т. Кавецкий. – Брест, 2005. – С. 25.

**Антанюк Георгій Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 8-9 : фат. – (Імёны на карце Кобрыншчыны).

**Памятныя даты** вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем. 80 гадоў з дня нараджэння Г. А. Антанюка (1942) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 44.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

ГУК «Кобринская централизованная библиотечная система» начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**З філасофскім** падыходам да жыцця // Кобрынскі веснік. – 2013. – 23 лютага. – С. 4.

Кобрынскі раён
Мацы
Антанюк Георгій Аляксандравіч
Філосафы
Сацыёлагі
Прафесары